14. *Лукманова Р. Р.* Основные тенденции развития школы и педагогической мысли Западной Европы в XI—XIII вв.: Автореф. дис. ... канд. пед. наук. М., 1989. С. 7.

15. *Сидорова Н. А.* Очерки ренней городской культуры во Франции. М., 1953. С. 246.

16. *Irsay S.* Histoir des universités françaises et étrangères des origines à nos jour. Paris, 1933—1935. V. 1. S. 23—48.

17. *Конан У. М.* Адраджэнне //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993. Т. 1. С. 59.

18. *Stierli J.* Les jesuites. Paris, 1967. C. 17—34.

SUMMARY

*On the example of medieval history in West European region the dependence of educational process school policy on all-political factors and cooperation with church in shown. Important stages of political and church impact on school were given in a chronological frame. The main content is revealed as well.*

УДК 947.0857(476)

*М. М. Забаўскі*

# Палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у І Расійскую думу (студзень-красавік 1906 г.)

У беларускай гістарыяграфіі вызначанае пытанне ў агульнай форме асвятлялася ў працах М. В. Біча [1], К. Л. Шабуні [2] і манаграфіі М. А. Марцюховай [3].

У артыкуле ставіцца мэта паказаць адносіны манархічных, ліберальных, леванародніцкіх, сацыял-дэмакратычных партый і іх прыхільнікаў да выбараў у І Дзяржаўную думу Расіі, прааналізаваць іх тактыку і спецыфіку дзейнасці на Беларусі (у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях).

У сувязі з выбарамі ў Дзяржаўную думу Расіі разгарнулася барацьба партый і груп рознай ідэалагічнай і палітычнай арыентацыі за ўплыў на працоўныя масы і галасы выбаршчыкаў. Многія з партый ды іх органаў друку былі ўтвораны ў самы разгар выбарчай кампаніі і рабілі першыя крокі на палітычнай арэне.

Інтарэсы ўрадавага лагера на выбарах абаранялі памешчыцка-манархічныя чарнасоценныя партыі. Самай буйной і ўплывовай з іх быў Саюз рускага народа (СРН). К пачатку

1906 г. саюз значна пашырыў сферу свайго ўплыву. Яго б… чымі справамі кіраваў Галоўны савет, які складаўся з 12 … вадзейных членаў і 18 кандыдатаў. Паступова сфарміравал… разгалінаваная сетка мясцовых арганізацый: губернскіх, п… товых, гарадскіх саветаў. Галоўны Савет выдаваў друкава… орган саюза — газету «Русское знамя». Найбольш вядомымі … дэрамі СРН былі памешчыкі У. М. Пурышкевіч і М. Я. М… каў. Старшынёй Галоўнага савета партыі быў дзіцячы ўр… доктар медыцыны А. І. Дубровін. Уся дзейнасць «саюзнік… вялася пад лозунгам «праваслаўе, самадзяржаўе, народнасц…

Кіравалі рэгіянальнымі саюзамі буйныя памешчыкі, г… бернскія і павятовыя прадвадзіцелі дваранства. Яны імкну… прыцягнуць на свой бок сялян, рабочых, дробных рамеснік… Важную ролю ў гэтай справе адыграла праваслаўнае духав… ства [4, с. 62—65].

У пачатку 1906 г. арганізацыі чарнасоценцаў існав… ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Глыбокім. Прычым у Го… лі дзейнічалі баявыя дружыны, якія ўчынялі тэрор і займал… аховай грамадскага парадку. Субсідыі з сакрэтнага фон… Міністэрства ўнутраных спраў ішлі на выданне агітацыйн… матэрыялу. Вялікую фінансавую падтрымку аказвалі пра… слаўныя брацтвы.

У студзені—лютым 1906 г. Віленскае свята-духоўнае бра… ва значна пашырыла колькасць новых аддзелаў СРН у паве… У іх уступалі сяляне і мясцовая «руская» інтэлігенц… Адкрыццём новых школ, чытальняў, рэлігійных чытанн… брацтва далучылася да рускай справы ў краі і стала на абар… праваслаўя ў барацьбе з палякамі і яўрэямі [5]. Арганізат… Рускага выбарчага бюро разумелі, што ў Віленскай губе… першынстваваць на выбарах будуць палякі і яўрэі, і тым … менш заклікалі аддаваць галасы за тых, хто з'яўляец… «рускім калі не па нараджэнню, то па абавязку». Ролю агіт… тара і арганізатара «сапраўдна рускіх» людзей у заходніх г… бернях у час разгару выбараў у І Дзяржаўную думу ўзяла … сябе газета «Окраины России». Сярод яе заснавальнікаў бы… прадстаўнікі вышэйшага праваслаўнага духавенства, руска… арыстакратыі, некалькі прафесараў, грамадскіх дзеячаў, пуб… цыстаў, купцоў ды інш. У рэдакцыю «Окраины России» ўвах… дзілі Н. А. Звераў, В. Ф. Дзейтрых, М. М. Бародкін, А. М. Ка… нілоўскі, князь А. А. Шырынскі-Шахматаў, Б. М. Якунчыка… ды інш. Рэдактарам газеты з'яўляўся П. Р. Бывалькеві… беларус па паходжанні, а выдаўцом П. А. Кулакоўскі. Перш… нумар выйшаў 6 сакавіка 1906 г. «У гэты час, — адзначалас… ў газеце, — палякі ўжо падрыхтавалі праект сваёй аўтаном…

і ўзнікла пагроза адзінству імперыі. З гэтага дня і на працягу сямі гадоў газета вяла раз'юшаную шавіністычную агітацыю, накіраваную супраць палякаў і каталіцкага касцёла, супраць яўрэяў, а таксама супраць беларускіх «сепаратыстаў» [6].

Задачу аб'яднання «рускіх» людзей Заходняга краю ставіла перад сабой і шавіністычная арганізацыя Паўночна-Заходняе рускае веча, створаная ў снежні 1905 г. у Вільні. У яе планы таксама ўваходзіла «абарона» інтарэсаў рускага насельніцтва за ўсіх праявах палітычнага і грамадскага жыцця. Органам саюза была газета «Белая Русь», якая выдавалася з 19 лютага па 20 чэрвеня 1906 г. у Вільні.

Нягледзячы на прывілеяванае становішча і падтрымку адміністрацыі краю, перадвыбарчая агітацыя чарнасоценных арганізацый не мела поспеху. У саюзе з чарнасоценцамі на выбарах у заходніх губернях выступалі акцябрысты.

Арганізатарамі аддзелаў «Союза 17 октября» у Вільні, Мінску, Віцебску, Гродне, Магілёве, Гомелі ды іншых гарадах былі ў асноўным мясцовыя рускія чыноўнікі — манархісты, памешчыкі, праваслаўныя святары. Мясцовыя акцябрысты, у адрозненне ад сталічных, адвяргалі любыя пагадненні з аўтанамістамі і крытыкавалі іх у сваіх органах друку. Прызнаным лідэрам акцябрыстаў у заходніх губернях з'яўляўся Г. К. Шмід.

Выбарчую кампанію акцябрысты пачалі ў лістападзе 1905 г., калі па іх ініцыятыве ў Пецярбургу ўзнік Аб'яднаны камітэт памяркоўных партый. У яго ўвайшлі прадстаўнікі дзесяці канстытуцыйна-манархічных арганізацый, з ліку якіх пазней быў створаны перадвыбарны блок чатырох: з самога «Союза 17 октября», Партыі прававога парадку[1], «Гандлёва-эканамічнага саюза» і Прагрэсіўна-эканамічнай партыі[2]. Блок чатырох дзейнічаў у Маскве і Пецярбургу, а таксама на месцах (у Казані, Тамбове, Яраслаўлі, Магілёве) [4, с. 98].

У перыяд выбарчай кампаніі ў І Дзяржаўную думу «Союз 17 октября» і генетычна звязаныя з ім партыі (Партыя прававога парадку, Прагрэсіўная партыя) першымі прадэманстравалі сваю асобую «адданасць» манархіі і лаяльны нацыяналізм, нападаючы на праграму кадэцкай партыі ў нацыянальным пытанні. Затым, у 1906 г., яны падтрымалі ўрад па пытаннях «законнасці і парадку». Але гэтыя намаганні мелі для акцябрыстаў адмоўныя вынікі. Дэмакратычныя выбаршчыкі не пайшлі за імі на выбарах.

---

[1] Партыя прававога парадку — палітычнае фарміраванне акцябрысцкага напрамку.

[2] Прагрэсіўная партыя, якая ў расійскім ліберальным лагеры займала месца на правым флангу.

У адрозненне ад правых і акцябрыстаў канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (кадэты) вяла выбарчую кампанію больш тонкімі метадамі. Установчы з'езд партыі адбыўся ў кастрычніку 1905 г. Ён залажыў аснову арганізацыйнай структуры, прыняў праграму і статут, абраў ЦК. На другім з'ездзе ў студзені 1906 г. адбылося канчатковае канстытуіраванне партыі. Было прынята рашэнне дадаць да асноўнай назвы партыі «Канстытуцыйна-дэмакратычная» словы «партыя народнай свабоды». Вядучую ролю ў партыі кадэтаў адыгрывалі Павел і Пётр Даўгарукавы, П. Б. Струве, І. І. Петрункевіч, А. І. Шынгароў, М. В. Сабашнікаў ды інш. Лідэрам партыі, яе галоўным тэарэтыкам і стратэгам з'яўляўся гісторык П. М. Мілюкоў. У партыю кадэтаў уваходзілі прадстаўнікі інтэлігенцыі, часткі памешчыкаў, сярэдняя гарадская буржуазія.

У час рэвалюцыі 1905—1907 гг. у мясцовыя партыйныя арганізацыі ўваходзілі і прадстаўнікі сацыяльных нізоў: рабочыя, рамеснікі, служачыя, сяляне. Найбольш аптымальным варыянтам грамадскага прагрэсу кадэты лічылі капіталізм. Яны выступалі супраць гвалтоўных сацыяльных пераваротаў за эвалюцыйнае развіццё грамадства, патрабавалі замены неабмежаванага самадзяржаўнага рэжыму канстытуцыйна-парламентарнай манархіяй англійскага тыпу. Кадэты праводзілі ідэю аб падзеле заканадаўчай, выканаўчай, судовай улады, стварэнні адказнага перад парламентам урада, рэформы суда, мясцовага самакіравання. Выступалі за ўвядзенне ў Расіі ўсеагульнага выбарчага права, ажыццяўленне дэмакратычных свабод — сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў ды інш. Яны лічылі, што Расія павінна быць унітарнай дзяржавай з правам культурна-нацыянальнага самавызначэння для ўсіх народаў, што насяляюць імперыю, —выкарыстаннем нацыянальнай мовы ў школах, судзе, вышэйшых навучальных установах, захаваннем і развіццём літаратуры і культуры кожнага народа [7].

Асноўная маса мясцовых кадэцкіх арганізацый узнікла ў перыяд выбарчай кампаніі ў І Думу. У гэты час партыя аб'ядноўвала каля 60 тыс. чалавек. На Беларусі ў 1905—1906 гг. арганізацыі кадэтаў існавалі ў Магілёве, Гомелі, Пінску і Віцебскай губерні. У разгар выбарчай кампаніі (6 студзеня 1906 г.) выйшаў першы нумар кадэцкай газеты «Могилёвский голос». Рэдактару-выдаўцу Ю. Бехлі дапамагалі такія аўтарытэты кадэцкай партыі, як П. М. Мілюкоў, П. Б. Струве, І. В. Гесен, М. І. Фрыдман ды інш. У выніку работы рэдакцыі ў Думу ад Магілёўскай губерні былі абраны 4 кадэты з 7 дэпутатаў, прычым дэпутацкі мандат атрымаў адзін з рэдактараў «Могилёвского голоса», памочнік прысяжнага паверанага

ў Магілёве Р. М. Цвёрды. Пасля роспуску І Дзяржаўнай думы газета (22 жніўня 1906 г.) спыніла існаванне. Усяго выйшаў 191 нумар [8].

Але для заснавання масавых аддзелаў кадэтаў на Беларусі не існавала спрыяльнай сацыяльнай глебы: адсутнічалі земствы і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Акрамя таго, у Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай губернях на дзейнасць партыі кадэтаў існавала афіцыйная забарона. Паліцыя імкнулася не дапускаць іх сходаў [9]. У дадзеных абставінах канстытуцыйныя дэмакраты былі вымушаны пераносіць сваю работу ў нацыянальныя групы польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх арганізацый.

Выбары пачаліся ў сакавіку 1906 г. Першыя вынікі не далі яснай карціны аб расстаноўцы палітычных сіл, але ў далейшым ходзе выбарчай кампаніі выразна высветлілася перамога партыі канстытуцыйных дэмакратаў. Яна была самай левай легальнай партыяй, якая выступала з апазіцыйнымі заявамі ў адносінах да ўрада і не шкадавала абяцанняў рабочым і сялянам. У брашуры «Чаго жадае партыя “Народнай свабоды”» кадэты дэкларавалі, што імкнуцца да свабоды, «шырокага надзялення сялян зямлёй і паляпшэннем становішча рабочых». Не спакушаныя ў палітыцы, дэмакратычныя выбаршчыкі ў большасці аддалі ім свае галасы.

У пачатку сакавіка 1906 г. быў створаны Віленскі яўрэйскі выбарчы камітэт. У яго, акрамя «Саюза для дасягнення раўнаправаўя яўрэйскага насельніцтва ў Расіі», увайшлі Яўрэйская група канстытуцыйна-каталіцкай партыі, прадстаўнікі віленскага рабіната, галоўных яўрэйскіх устаноў Вільні і Літоўскі выбарчы камітэт.

Напярэдадні выбараў у Дзяржаўную думу паглыбілася палітычная дыферэнцыяцыя сярод палітычна актыўнай часткі польскага насельніцтва ў Беларусі і Літве. 7 лютага 1906 г. на ўстаноўчым сходзе ў Вільні было абвешчана стварэнне Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (ККП). Арганізатарам і кіраўніком партыі быў віленскі біскуп барон Э. Ю. Роп. Амаль адначасова ён пачаў выдаваць газеты «Навіны віленьске», «Пшыяцель люду», «Таварыш працы» [10].

З лютага 1906 г. партыя Э. Ю. Ропа ўключылася ў выбары. Яе аддзяленні існавалі ў Віленскай і некаторых паветах Гродзенскай губерняў, дзе большасць насельніцтва складалі католікі. Актыўную прапаганду сваёй праграмы ККП разгарнула з дапамогай уласнага друку і ксяндзоў. Стаўка рабілася на курыю землеўладальнікаў. У выніку ў 7 паветах Гродзенскай губерні менавіта па гэтай курыі ККП правяла ў склад

выбаршчыкаў большасць сваіх прадстаўнікоў. У Віленскай губерні партыя Э. Ю. Ропа таксама кантралявала сітуацыю, прычым мела вялікі аўтарытэт і ў сялянскай курыі. У гарадской, нягледзячы на актыўную дзейнасць ККП, перавага была на баку яўрэйскіх арганізацый.

Каб захаваць пазіцыі палякаў у краі ва ўмовах беларускага і літоўскага нацыянальнага руху, актыўную дзейнасць разгарнулі краёўцы, плынь польскага нацыянальнага руху ў Беларусі і Літве. У сваёй грамадска-палітычнай дзейнасці яны выходзілі з прызнаных нацыянальна-культурных, эканамічных, рэлігійных і гістарычных асаблівасцяў Беларусі і Літвы. Яны адчувалі свае беларускія або літоўскія карані, выйшлі з той часткі грамадства, свядомасць якой акрэслівала формула: «літвін па паходжанні, паляк па нацыянальнасці». Краёўцы выступалі за аўтаномію беларуска-літоўскага краю. Плынь падзялялася на 2 кірункі: кансерватыўную і ліберальна-дэмакратычную [11].

Менавіта ў Віленскай і Мінскай губернях польскія камітэты дасягнулі на выбарах найбольшага поспеху. У першай польскія землеўладальнікі заключылі пагадненне з сялянскай курыяй. Сяляне былі «ізаляваны» ад саюза з гарадской курыяй энергіяй Э. Ю. Ропа і актыўнасцю ККП. У другой быў створаны блок землеўладальнікаў і гараджан, што дало максімальную выгаду краёўцам-кансерватарам.

Вялікія патэнцыяльныя магчымасці ўзначаліць выбарчую кампанію і павесці працоўныя масы мелі эсэры, прадстаўнікі Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Эсэраўскія патрабаванні выражаліся ў крылатай формуле «Зямля і воля», якая стала лозунгам першай расійскай рэвалюцыі.

Канчатковае рашэнне аб тактыцы байкоту ў перыяд выбараў у Беларусі было прынята на з'ездзе прадстаўнікоў эсэраўскіх арганізацый, які праходзіў 23—26 красавіка 1906 г. у Віцебску [12]. Тактыка байкоту засталася нязменнай.

Разам з эсэрамі і рэвалюцыйна-дэмакратычнымі партыямі і арганізацыямі краіны байкатавала выбары ў І Дзяржаўную думу Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) — нацыянальная партыя леванародніцкага кірунку.

У лістоўцы «Царава Дума» сцвярджалася, што царскі маніфест аб скліканні Думы — «ашуканства». У гэтай сувязі ў ей змяшчаўся заклік да далейшай барацьбы: «Патрабуем, каб кожны народ меў права сам пастанаўляць аб сваіх правах, выбіраць сабе сваіх чыноўнікаў і судзіць іх, гаварыць, пісаць і вучыцца па-свойму. Патрабуем, каб кожны народ меў свой сэйм у сваім краі! Далоў цара і яго правіцельства! Далоў цараву Думу! Хай жывець народнае праўленне і Канстытуцыйны сход у Вільні» [13].

Ініцыятыва байкоту выбараў у Думу належала бальшавікам. Яшчэ пасля выдання выбарчага закону ад 11 снежня 1905 г. бальшавікі выступілі за байкот, меншавікі — за прыстасаванне да «канстытуцыі», за адмаўленне ад паўстання, за перанясенне цэнтра цяжару ўсёй работы ў легальны прафесійны рух [14].

Ужо ў жніўні Абласны камітэт Паўночна-Заходняга саюза выдаў заклік «Да байкоту булыгінскай Думы». У ёй гаварылася, што скліканнем Думы ўрад імкнецца прыцягнуць на свой бок буйных капіталістаў і землеўладальнікаў, учыніць расправу з камітэтчыкамі! «Мы будзем супрацьстаяць гэтай камедыі ўрада — Дзяржаўнай думе, у якой мы пазбаўлены ўсякіх правоў», — гаварылася ў закліку. Прапаганда байкоту спалучалася з прамым зваротам да ўзброенага паўстання: «Мы будзем паўсюдна наладжваць мітынгі з вынясеннем пратэсту супраць ўрадавага падману, мы будзем выходзіць на вуліцы, урэшце са зброяй у руках мы будзем супрацьстаяць выбарам і дабівацца сваіх правоў. Далоў Дзяржаўную думу! Няхай жыве ўстаноўчы сход на аснове ўсеагульнага, прамога выбарчага права! Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка! Далоў самадзяржаўе! Няхай жыве сацыялізм!» [15, с. 469—470]. У гэтым жа месяцы Саюз двойчы выпусціў лістоўку «Далоў Дзяржаўную думу!» агульным тыражом 22 тыс. экзэмпляраў [15, с. 476].

Такім чынам, самай уплывовай партыяй манархічнага лагера ў перыяд выбараў у Расійскую Дзяржаўную думу першага склікання быў «Саюз рускага народа». Найбольшага поспеху агітацыя манархістаў-чарнасоценцаў дасягала ў рэгіёнах са шматнацыянальным складам насельніцтва, да якіх адносіліся і заходнія губерні. Значную фінансавую ды ідэалагічную падтрымку яны атрымлівалі ад праваслаўных брацтваў. Ролю агітатара і арганізатара «истинно-русскнх» у Беларусі ўзяла на сябе газета «Окраины России». У саюзе з чарнасоценцамі (на выбарах) выступілі акцябрысты на чале з іх лідэрам Г. К. Шмідам. Генетычна звязанай з «Союзом 17 октября» была Партыя праванога парадку і Прагрэсіўная партыя.

Ліберальныя партыі і групы заклікалі народныя масы прыняць удзел у выбарах. У Магілёве, Гомелі, Віцебску, Мінску, Пінску найбольшую актыўнасць праяўлялі кадэты. Але афіцыйная забарона на іх дзейнасць у шэрагу губерняў вымушала кадэтаў пераносіць сваю агітацыю ў нацыянальныя групы польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх арганізацый. Дзякуючы іх падтрымцы, а таксама ў сувязі з тым, што кадэты былі самай левай легальнай апазіцыйнай ураду партыяй, яны атрымалі перамогу на выбарах.

Каб захаваць пазіцыі ў краі, ва ўмовах уздыму белару… і літоўскага нацыянальнага руху актыўную дзейнасць раз… нулі краёўцы і Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і … ларусі, якія яднапі польскую і апалячаную беларускую шлях… і каталіцкае духавенства.

Бальшавікі і ўсе дэмакратычныя партыі разлічвалі на … рэвалюцыйны ўздым і заклікалі да байкоту Думы і падрыхт… працоўных мас да звяржэння царызму рэвалюцыйным шлях…

За байкот выступала таксама Беларуская сацыялістыч… грамада, якая вылучала і прапагандавала ідэю народнага с… Літвы і Беларусі ў Вільні.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Біч М. В.* Дэпутаты ад Беларусі ў І і ІІ Дзяржаў… думах //Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1. С. 393.

2. *Шабуня К. І.* Аграрный вопрос и крестьянское движе… в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962.

3. *Мартюхова М. А.* На переломе революции. Мн., 1986.

4. История политических партий Росии. М., 1994. С. 62—6…

5. Гродненские губернские ведомости. 1906. 24 февр.

6. Окраины России. 1912. 22—29 дек.

7. Протоколы ЦК кадетской партии периода пер… Российской революции //Вопросы истории. 1990. № 2. С. 33.

8. Могилёвский голос. 1906. 16 февр.

9. Речь. 1906. 2 марта.

10. Окраины России. 1906. 5 марта.

11. *Смалянчук А.* Краёўцы //Энцыклапедыя гісторы… Беларусі. Мн., 1997. Т. 4. С. 246.

12. ДАРФ. Ф. ДП.00. 1906. Воп. 35. Спр. 20. Ч. 1. Л. 4.

13. *Біч М. В.* Гісторыя Беларусі (канец XVIII ст. — 1917 … Мн., 1998. С. 199.

14. *Король А. С.* Большевики Белоруссии в революци… 1905—1907 гг. Мн., 1986. С. 131.

15. Документы и материалы по истории Белорусси… (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3.

## SUMMARY

*The article gives an outline of the different attitudes of monarc… liberal-narodnik, social-democratic parties and their supporters to th… elections of the first Russian Duma. The author considers strategy an… specific character of their activities in Belarus (Vilno, Vitebsk, Grodn… Mogilev and Minsk regions).*